# НЯХАЙ ЖЫВЕ 42-я ГАДАВІНА ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА!

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

Беларускі
УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома
Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 35-36 (380-381) | Пятніца, 6 лістапада 1959 года. | Цана 20 кап.




# НАШ КАСТРЫЧНІК!

Гісторыя ведае нямала знамянальных дат. Быццам вехі, адзначаюць яны павароты, на шляху, пройдзеным чалавечым грамадствам. Адны з гэтых вехаў ведаюць шырокія колы людзей, іншыя—захоўвае толькі памяць вучоных. Але ёсць у гісторыі адна дата, адзін дзень, які ведае кожны, і які назаўсёды, пакуль будзе існаваць на зямлі чалавек, захаваецца ў памяці пакаленняў. Гэта дзень, калі залпы легендарнай «Аўроры» абвясцілі свету аб нараджэнні новага, сацыялістычнага грамадства. І як не ганарыцца, што іменна нашай краінай, нашымі бацькамі былі закладзены асновы светлай будучыні чалавецтва!

Вялікая неперáможная сіла ідэй Кастрычніка, ідэй, якія лістападаўскім днём 1917 года вялі на штурм Зімняга салдат і рабочых, сялян і матросаў; ідэй, што дапамаглі нам выстаяць у агні грамадзянскай вайны, а затым аднавіць разбураную гэтай вайной і інтэрвенцыяй гаспадарку; ідэй, што і цяпер прымушаюць мацней біцца сэрцы людзей, узнімаюць іх на барацьбу за лепшае будучае. А калі наляцела віхура вайны, калі на зямлю сацыялізма пасягнула фашысцкая навала, народ, як адзін, паўстаў на абарону заваёў Кастрычніка—і перамог.

Азірніцеся на шлях, пройдзены намі за 42 гады. У неймаверна цяжкіх умовах, пад гарматны гром і дзікае шалёнае выццё ўсяго капіталістычнага свету пачыналі мы вялікую справу перабудовы. І былі мы тады адны на свеце. Зусім адны. А цяпер? Цяпер 950 мільёнаў людзей крочаць поплеч з намі ў адных шарэнгах пад Сцягам Кастрычніка. У гэтай вялікай сям'і—кітайцы і палякі, карэйцы і балгары, манголы і румыны, в'етнамцы і чэхі, албанцы і венгры, немцы і югаславы. І наша свята—гэта іх свята.

А колькі ўсяго ў нас сяброў ва ўсіх кутках свету! Нават у тых краінах, дзе зараз пануе капіталізм. Ідуць і ідуць праз Мінск на Маскву «цягнікі дружбы» з замежнымі гасцямі, і прагульваюцца па шырокіх, пасвяточнаму прыбраных мінскіх вуліцах дзеці розных народаў.

42 гады ўпартага змагання, 42 гады барацьбы і перамоі не прайшлі дарэмна. Наша краіна ператварылася ў магутнейшую дзяржаву свету. Першы штучны спадарожнік Зямлі, які прачарціў зорнае неба зоркай першай велічыні, быў створаны рукамі і геніем нашых вучоных і рабочых. Першая разведчыца міжпланетных прастораў палядела ў космас, каб раскрыць яго таямніцы нашым вучоным, наш савецкі герб і вымпел першымі дастаўлены на Месяц. Нашы моры баразніць першы атамны ледакол. А цяпер міжпланетная навуковая станцыя апісвае гігантскія кругі вакол Зямлі і Месяца. З дапамогай апаратуры, устаноўленай на ёй, сфатаграфаваны адваротны бок Месяца. Мора Масквы, кратэр Цыялкоўскага, мора Мары—гэтыя рускія назвы цяпер назаўсёды застануцца на карце Месяца.

Ну, а далей. І далей таксама няспынны рух уперад. Яшчэ Маякоўскі пісаў:

— Я планов наших
люблю громадьё,
Размаха шаги
саженьи!

Мы плануем дзёрзка, але плануем упэўнена. 42-я гадавіна Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі знамянальна яшчэ і тым, што савецкі народ адзначае яе ў першы год сямігодкі. І няма сумнення, мы выканаем усе нашы планы. Для гэтага нам патрэбна адно—мір!

Закон аб міры быў першым Законам, народжаным Кастрычніцкай рэвалюцыяй. Мір патрэбен усім народам, усім краінам. Наша дзяржава, старшыня нашага урада М. С. Хрушчоў нястомна і няспынна змагаюцца за трывалы мір ва ўсім свеце. І за гэта ім—удзячнасць народаў усіх кантынентаў.

Мір пераможа, бо ідэі Кастрычніка — неперáможны!

## Кастрычнік ідзе!

Кастрычнік ідзе дарагі.
Расквечан мой горад прыгожы.
Навокал сцягі і сцягі
На плошчах,
дамах,
агарожы.

Кастрычнік ідзе!

Грыміць паўз трыбуны парад
Вясновай ракою шырокай—
Кастрычнік ступае крокам
Камуністычных брыгад.

Кастрычнік ідзе!

Агнёў сямігодкі прыліў
Займае краіну шырай.

Кастрычнік ідзе па зямлі
Візітамі дружбы і міру.

Кастрычнік ідзе!

І свет у здзіўленні прыціх
І нізка ўпалі аблокі,
Бо шлях да планетаў другіх
Для нас не такі ўжо далёкі.

Кастрычнік ідзе!
Прарокі,
што нема раўлі,
Цяпер ухмыляюцца млосна.

Кастрычнік ідзе па зямлі,
Кастрычнік ідзе.
У космас!

У. ПАЎЛАЎ.

## ВЕЧАРЫ, ПРЫСВЕЧАНЫЯ СЛАЎНАЙ ГАДАВІНЕ

Пятага лістапада ў памяшканні Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балету адбыўся агульнауніверсітэцкі вечар, прысвечаны 42 гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. З дакладам аб 42 гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі выступіў намеснік сакратара парткома універсітэта П. Ф. Пратасеня. Пасля даклада прысутныя праслухалі оперу Бізэ «Шукальнікі жэмчуга». А затым у віхры вальсу закружыліся і тыя, хто толькі ў гэтым годзе пераступіў парог нашага універсітэта, і выкладчыкі, скроні якіх ўжо кранула сівізна.

Вечары, прысвечаныя слаўнай гадавіне, адбыліся таксама на ўсіх факультэтах універсітэта.

# НАМ АДКРЫТЫ ШЫРОКІЯ ДАЛІ

* * *

## ПРЫГАЖОСЦЬ НАШАЙ ВОСЕНІ

*Над савецкай зямлёй цяпер стаіць восень. Тая пара года, калі ідуць дажджы і стаяць густыя туманы, калі прырода, пазбаўленая зеляніны, глядзіць на нас спачатку прывабна і развітальна, а потым сумна і няўтульна. Знешне яна, відаць, нічым не адрозніваецца ад той восені, якая была некалі, сто ці сто пяцьдзесят гадоў назад.*

*Аднак з 1917 года пры ўспаміне аб восені, аб Кастрычніку нашы сэрцы перапаўняюцца не пачуццём ціхага замілавання і суму па завяўшых травах і кветках, а пачуццём смелай, баявой энергіі, нястрымнага парыву наперад да здзяйснення самых запаветных мар чалавецтва. І ў дажджлівы дзень усмешка і радасць свецяцца на твары савецкага чалавека. І хоць не бачылі мы па сваёй маладосці, як*

*Мужных, смелых*
*Сцяг чырвоны*
*Вёў са зброяй*
*Праз баі да бессмяроцця,*

*няхай не ўдзельнічалі мы ў штурме Зімняга і не хадзілі апавітыя накрыж лентамі патронаў, аднак мы разам з нашымі бацькамі і дзядамі бачым нашу сёлетнюю восень такой, якой яна была 42 гады назад. І мы любуемся не пазалотай прыдарожных бярозак, хаця не менш, чым хто, здольны на гэта, не адлятаючымі ў вырай гусямі і жураўлямі, а першымі нашымі спадарожнікамі Зямлі, першым ледаколам з атамным рухавіком і тым цёплым подыхам ветру над краінамі свету, што ўзнік дзякуючы намаганням савецкіх людзей, якія ідуць наперад пад кіраўніцтвам слаўнай Камуністычнай партыі.*

*Мы, студэнты, радуемся, што ва ўсім гэтым творчым і працоўным руху ёсць доля і нашых намаганняў, што сёлетняя восень — адна з найбольш яркіх дат у развіцці сацыялістычнай рэвалюцыі, і мы — барацьбіты яе!*

*І. АБАБУРКА,*
*студэнт II курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.*

## ГЭТА БУДЗЕ

Кажуць, лічбы сухая рэч. Бадай, што толькі эканамісты бачаць у іх нейкую паэзію, толькі для іх мова лічбаў — жывая і ясная. Але ці толькі для іх? Паспрабуйце праверыць гэта самі, пазнаёміўшыся з некаторымі лічбамі, якія характарызуюць перспектывы развіцця нашага універсітэта ў бліжэйшыя гады.

**Ва універсітэце арганізавана праблемная лабараторыя «Вылічальны цэнтр». З выдаткаваных для гэтай мэты 1 мільёна 665,5 тысячы рублёў ужо асвоена 1200000 рублёў.**

**У галоўным вучэбным корпусе універсітэта дадаткова да першапачатковага праекта будуць створаны праблемныя лабараторыі вылічальнай матэматыкі і тэхнікі, хіміі і фізікі палімераў, атамнай і малекулярнай электронікі. На абсталяванне гэтых лабараторый выдаткоўваецца звыш 8 мільёнаў 200 тысяч рублёў.**

**У 1959-65 гадах будзе арганізавана праблемная навукова-вадаследчая лабараторыя па ядзернай фізіцы. Яе стварэнне патрабуе капіталаўкладанняў на агульную суму звыш 10 мільёнаў рублёў.**

* * *

## ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ НА НОВЫМ ЭТАПЕ

Гістарычны факультэт сустракае 42-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі новымі поспехамі ў вучэбнай, навучальнай і выхаваўчай рабоце. Для нас гэты год знамянальны тым, што гістарычны факультэт адзначае свае 25-годдзе.

За 25 год свайго існавання факультэт падрыхтаваў каля 1300 спецыялістаў. Сотні нашых выпускнікоў працуюць дырэктарамі, завучамі і выкладчыкамі сярэдніх школ, у навукова-даследчых установах, архівах, музеях, у партыйных, камсамольскіх і савецкіх органах.

У пасляваенны перыяд звыш 50 выпускнікоў закончылі аспірантуру і абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

Навуковыя работнікі факультэта вядуць значную навуковую работу. Толькі за апошнія два—тры гады выйшлі з друку манаграфіі дацэнта Л. С. Абэцэдарскага «Беларусы ў Маскве», дацэнта М. В. Фрыдман «Адмена прыгоннага права ў Беларусі», дацэнта Г. М. Ліўшыца «Кумранскія рукапісы», дацэнта Трухнова «Германскае пытанне на лонданскай рэпарацыйнай канферэнцыі».

Калектыў навуковых работнікаў факультэта ўдзельнічаў у стварэнні двухтомнай гісторыі БССР, а таксама ў напісанні падручніка па гісторыі БССР для сярэдніх школ.

Дасягненне новай, больш высокай ступені ў падрыхтоўцы гісторыкаў з універсітэцкай адукацыяй ажыццяўляецца шляхам паляпшэння складу студэнтаў за лік пераважнага прыёму на гістарычны факультэт асоб, якія маюць пэўны вопыт работы на вытворчасці, і шляхам паляпшэння арганізацыі вучэбнага працэсу.

Згодна з новым вучэбным планам гістарычны факультэт нашага універсітэта будзе рыхтаваць выкладчыкаў гісторыі і Канстытуцыі СССР для ўсіх тыпаў сярэдніх школ, а таксама гісторыкаў-архівазнаўцаў, музеязнаўцаў, археолагаў і этнографаў.

Зыходзячы з задач перабудовы сістэмы народнай асветы, павышэння выхаваўчай ролі школы, новы вучэбны план прадугледжвае значнае павышэнне педагагічнай падрыхтоўкі выпускнікоў факультэта. У новым вучэбным плане павялічана колькасць гадзін на вывучэнне педагогікі і яе гісторыі, псіхалогіі і методыкі. Намнога павялічыцца педагагічная практыка. Студэнты ў восьмым семестры накіруюцца на педагагічную практыку ў школы на 16 тыдняў. Для студэнтаў, якія спецыялізуюцца па архівазнаўству, музеязнаўству або іншых спецыяльнасцях, устанаўліваецца 8 тыдняў педагагічнай практыкі ў школе і 8 тыдняў у музеях, дзяржаўных архівах, навучальных установах. Упершыню вучэбны план для ўсіх студэнтаў прадугледжвае абавязковую 4-тыднёвую практыку ў піянерскіх лагерах.

Новы вучэбны план уводзіць шэраг новых абавязковых прадметаў — гісторыі мастацтва, гісторыі рускай савецкай літаратуры, асноў савецкага права, гісторыяграфія гісторыі СССР і іншых.

У сувязі з пераходам у бягучым навучальным годзе на новы вучэбны план двух першых курсаў і пераходам у будучым навучальным годзе да падрыхтоўкі спецыялістаў па новых спецыяльнасцях (архівазнаўства, музеязнаўства, археалогія і інш.), кафедры факультэта прыступілі да падрыхтоўкі новых спецкурсаў, спецсемінараў, да распрацоўкі праграм, да падрыхтоўкі і выдання падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

**П. САВАЧКІН,**
**дэкан гістарычнага факультэта.**



*Галя Гадун і Жана Гардзеева прыйшлі ва універсітэт з вытворчасці. Дзяўчаты і цяпер не грэбуюць фізічнай работай — гэта бачыў кожны, хто працаваў побач з імі на будаўніцтве галоўнага корпуса універсітэта.*

## Святу—працоўныя падарункі

Добрымі працоўнымі справамі сустракае цудоўнае свята калектыў біёлага-глебавага факультэта. Напярэдадні Вялікага Кастрычніка з друку выйшаў зборнік навуковых работ вучоных біёлагаў «Пытанні фізіялогіі раслін і мікрабіялогіі». Гэты зборнік мае не толькі важнае навуковае значэнне. Ён прадстаўляе цікавасць і для сельскай гаспадаркі. Так, Ц. М. Годнеў і А. В. Лёшын у сваёй працы расказваюць аб практычным прымяненні кобальту для павышэння ўраджаю гародніны пры яе вырошчванні ў цяплічных умовах.

Цікавыя работы ў зборніку С. В. Калішэвіча, Б. Л. Эльберта і Л. А. Марчанкі.

Але не толькі зборнік змяшчае ў сабе ўсё тое, што змаглі зрабіць вучоныя ў падарунак 42-й гадавіне Кастрычніка. На ўсіх кафедрах факультэта ідзе дзейсная навукова-даследчая работа. Вось на кафедры генетыкі рашаецца важная праблема павышэння ураджайнасці кукурузы ва ўмовах БССР шляхам вывядзення новага гібрыда. Работа важная, патрэбная. Займаецца ёю з вялікім творчым уздымам акадэмік М. В. Турбін. Цесна звязана з запатрабаваннямі сельскай гаспадаркі і работа кафедры глебазнаўства. Летам студэнты пад кіраўніцтвам акадэміка І. С. Лупіновіча выязджалі ў саўгасы і калгасы для складання глебавых карт. Гэтыя карты даюць магчымасць устанаўліваць севазвароты з улікам мясцовых умоў, праводзіць вапнаванне глебы. Яны патрэбны кожнаму саўгасу і калгасу. Вось такія карты і складзены толькі сёлета для плошчы ў 52 тысячы гектараў пры планавым заданні ў 50 тысяч.

— Цяпер у нас гарачая пара,— гаворыць намеснік дэкана Сяргей Васільевіч Калішэвіч.—Нам патрэбна ў самыя сціслыя тэрміны закончыць пераноску батанічнага ўчастка на новае месца. Работа вялікая. Трэба перасадзіць каля 600 раслін.

Кіпіць жыццё на факультэце. Ёсць чым сустрэць біёлагам свята.

**А. КІТАЕЎ.**

## ХОЧАЦЦА ПРАЦАВАЦЬ ЯШЧЭ ЛЕПШ

Як ніколі радасна сустракаем мы свята Кастрычніка ў гэтым годзе.

Колькі радасных падзей адбылося за апошнія месяцы. Зусім нядаўна увесь свет ускалыхнула вестка аб фатаграфаванні нябачнага боку Месяца. А перад гэтым нястомны барацьбіт за мір Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў заваяваў сэрцы ўсіх простых людзей свету сваёй высакароднай місіяй міру. З кожным днём у нас становіцца больш сяброў і менш ворагаў. І хочацца працаваць яшчэ лепш, каб наша Радзіма стала яшчэ мацнейшай.

**М. ДОЎНАР,**
**работніца вярстальнага цэха друкарні выдавецтва БДУ.**



НА ЗДЫМКУ: макет касмічнай ракеты на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР прыцягнуў увагу нашага фатографа А. Шрубка.

## ВУЧОНЫЯ—ВЫТВОРЧАСЦІ

Нафта—гэта невычарпальная крыніца самых разнастайных карысных рэчываў. Адны з іх непасрэдна прымяняюцца на практыцы, іншыя служаць сыравінай для розных галін хімічнай прамысловасці. І каб выкарыстаць гэтыя каштоўныя прадукты, неабходна ўмець іх распазнаваць і выдзяляць з нафты і складаных сумесей яе перапрацоўкі.

Чатыры гады назад, абараніўшы доктарскую дысертацыю, Рыгор Лазаравіч Старобінец узначаліў кафедру аналітычнай хіміі універсітэта. І адразу ж ён сканцэнтраваў нешматлікі калектыў кафедры, якому дапамагалі студэнты-дыпломнікі і некалькі студэнтаў малодшых курсаў, на распрацоўцы новых метадаў аналізу і раздзялення прадуктаў перапрацоўкі нафты.

Нядаўна ў часопісе па аналітычнай хіміі паявіўся артыкул Р. Л. Старобінца напісаны, сумесна з асістэнтам кафедры аналітычнай хіміі Т. А. Бальшовай, у якім пададзена методыка храматаграфічнага аналізу сумесі вельмі блізкіх па хімічных уласцівасцях рэчываў, здабываемых з нафты—нармальных парафінаў і ізапарафінаў. Гэтай методыкай зацікавіліся супрацоўнікі Грозненскага навукова-даследчага нафтавага інстытута і вучоныя Чэхаславакіі.

Не менш важная і цікавая работа па храматаграфічнаму раздзяленню сераўтрымліваючых фракцый нафты, у якой прымаюць удзел асістэнт Т. А. Бальшова і аспірант В. С. Салдатаў. Гэтая работа выконваецца ў кантакце з Башкірскім філіялам АН СССР.

У сакавіку 1959 года Р. Л. Старобінец выступіў на Усесаюзным з'ездзе хімічнага таварыства імя Мендзелеева з дакладам аб распрацаваным на кафедры сумесна з аспірантам Э. В. Паварковым новым метадзе раздзялення бензінавых фракцый нафты з выкарыстаннем храматаграфіі на каўчукападобных палімерах.

Аналагічныя палімеры былі выкарыстаны Р. Л. Старобінцам, дацэнтам В. Р. Скараход, асістэнтам Л. І. Севасцьянавай і лабарантам Г. Н. Булацкай у якасці іёнаабменнікаў для выдзялення з раствораў малых колькасцей некаторых металаў у прысутнасці вялікай колькасці іншых металаў. Распрацоўка падобных метадаў раздзялення надзвычай важная і для хімічнага аналізу прымясей, і для тэхнічнага выдзялення рассеяных элементаў.

**Калектыў кафедры аналітычнай хіміі не абмяжоўваецца распрацоўкай актуальнай навукова-даследнай тэматыкі. На Мінскай ТЭЦ-2 было наладжана вывучэнне карозіі медных кандэнсатараў з выкарыстаннем іённага абмену.**

**В. СВІРЫДАЎ.**

# Ідуць журналісты

*(Святочны рэпартаж)*

У дні Кастрычніцкіх свят чалавечай радасці цесна ў сценах будынкаў, і яна бурнай людской ракой выплескваецца на вуліцы. Сапраўдны веліч свята пазнаеш толькі прайшоўшы па перапоўненых людзьмі вуліцах горада. Ідуць і ідуць калоны дэманстрантаў. А калі па шырокаму праспекту ўрачыста праплывае барэльеф бессмяротнага Ільіча з вялікімі літарамі «БДУ» уперадзе, вочы людзей цяплеюць і становяцца больш уважлівымі. Ідуць фізікі і географы, хімікі і філолагі, матэматыкі і юрысты, гісторыкі і біёлагі. Колькі тут будучых інжынераў, вучоных, вынаходцаў. А вось ідуць журналісты. Давайце больш уважліва ўгледзімся ў іх рады. Узначальвае калону загадчык кафедры журналістыкі Марк Саламонавіч Зярніцкі. Марк Саламонавіч напярэдадні свайго шасцідзесяцігоддзя. Але ён пa-ранейшаму поўны жыццёвых сіл і энергіі. Лепшы таму доказ—нядаўні выхад пад яго кіраўніцтвам першага нумара газеты «Журналіст». Гэта цудоўны святочны падарунак журналістам універсітэта. «Журналіст» яшчэ зусім малады, але пачуццё таго, што ён знаходзіцца ў надзейных руках, падбадзёрвае яго, і ён даверліва ўсміхаецца намесніку дэкана Рыгору Васільевічу Булацкаму і выкладчыкам кафедры Ніне Аляксееўне Сніцаравай, Арыадне Іванаўне Апелінскай і Аляксею Арсенцьевічу Волку, якія заняты ажыўленай размовай. А ім ёсць аб чым пагутарыць. Аляксей Арсеньевіч і Арыадна Іванаўна рыхтуюцца да абароны кандыдацкіх дысертацый. Пажадаем ім поспехаў у рабоце. Праўда, на Міхаіла Яўгеньевіча Цікоцкага «Журналіст» пазірае з нейкай насцярожанасцю. Гэта і зразумела. Міхаіл Яўгеньевіч выкладчык кафедры па стылістыцы і пры жаданні мог бы прад'явіць прэтэнзіі навароджанаму. Але настрой ва ўсіх святочны. «Журналіст» адчувае сябе выдатна. Тым больш, што за яго спіною магутная групіроўка студэнтаў-пяцікурснікаў. Іх працы ён у многім абавязан сваім з'яўленнем.

Развяваецца на ветры капна русых валасоў Івана Сіпакова — намесніка рэдактара першага выпуску. Ён глядзіць на радасную людскую раку, і магчыма іменна цяпер у Сіпакова зараджаецца новы верш аб юнацтве, шчасці і сяброўстве. І не бяда, калі гэтыя вершы не ўвойдуць у першы зборнік маладога паэта, які рыхтуецца да друку ў Белдзяржвыдавецтве. Сіпакоў жа толькі нядаўна выйшаў на паэтычную арбіту. Наперадзе яшчэ многа нераскрытых тэм, вершаў і, канешне. новыя зборнікі.

Побач з Іванам Сіпаковым крочыць Іван Пехцераў. Выхадзец з калгаснай вёскі, ён прысвяціў ёй большасць сваіх вершаў. Праца простага чалавека і прыгажосць роднай рускай прыроды—асноўныя матывы яго зборніка, які выходзіць у Смаленскім абласным выдавецтве.

Побач з паэтамі і нават злёгку абганяючы іх у сэнсе выхаду першага зборніка ідуць празаікі. Вось Барыс Сачанка. З выгляду ён мірны хлапец, але як супрацоўніку «Вожыка» яму лепш не пападайся. 1960 год будзе годам выхаду ў свет яго першай кнігі. Дваццаць шэсць апавяданняў самай разнастайнай тэматыкі ўвайшлі ў яе. «Дарога ішла праз лес»—будзе называцца гэты зборнік. Няхай жа творчая дарога Сачанкі пройдзе поўз лес першых літаратурных пошукаў і выйдзе на шырокі абшар пісьменніцкай працы.

Але пяты курс—гэта не толькі «Тры асілкі», аб якіх ішла гутарка вышэй. Гэта здольныя нарысісты Мікола Сокалаў і Астра Роніс, гэта Рудамётаў і Юрый Новікаў, гэта фотарэпарцёры Праваловіч і Дашук і многа, многа іншых. Ідуць вясёлыя, жыццярадасныя трэцякурснікі. Наперадзе Рыгор Струц з губым гармонікам. Гучыць задорная мелодыя беларускай полькі, і не ўтрымаліся Фурык з Астаповічам—пайшлі ў скокі—давай, давай, — падбадзёрвае іх «камсамольскае начальства» Ігар Хадановіч. Гэта касцяк агітбрыгады журналістаў, які паспяхова выступаў у калгасах Мінскага раёна. Некалькі у баку, крыху задумаўшыся, ідзе з велізарнай папкай падпахай Валодзя Паўлаў. У папцы матэрыялы новага зборніка «Узлётная паласа». У самога Паўлава ўзлётная паласа цяпер добрая, ды і «лётае» ён нядрэнна. У гэтым пераконваешся, чытаючы вершы маладога паэта і ў рэспубліканскіх газетах, і ў часопісах.

А вось і журналісты другога курса. У новай зялёнай фуражцы ідзе «наш прафсаюзны лідэр», як жартам называюць Філончыка на філфаку. Ён ідзе саліднай паходкай, нават крыху звысоку пазіраючы на Аладзьева і Высоцкага, якія вяселяцца побач. Чаму? Зусім нядаўна сябры віншавалі яго з жаніцьбай. А згадзіцеся самі, што жанатаму чалавеку трэба весці сябе, як належыць. Гэтай жа думкі прытрымліваецца і Яўген Радкевіч, які ўзначальвае групу радыёжурналістаў у складзе Халіпа, Астрэйкі і Высоцкага. Валодзя Халіп крыху недаспаў. Ага, так і ёсць. Яго зноў «папрасілі» аформіць насценгазету і зноў прышлося сядзець цэлую ноч, таму што днём ён маляваў загалоўкі для другой, а раніцой хаваўся ад чарговых заказчыкаў. Побач ідуць нарысісты Бабкоў і Шыманскі. Іх матэрыялы—нярэдкія госці на старонках рэспубліканскага друку. Фатаграфіі А. Шрубка ўсё часцей і часцей паяўляюцца ва універсітэцкай газеце. Вось і зараз ён няспынна шчоўкае затворам свайго фотаапарата. Поўныя творчых задум сатырыкі Кузмянкоў і Казявін. На каго апусціцца іх сатырычны меч, меркаваць цяжка. Але адбудзецца гэта абавязкова. А чаму такі заклапочаны твар у старшыні студкома Яўгена Шарамецьева. Паспрабуйце быць бесгурботным, калі прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы Зюба забараняе танцы, а студэнты, вось дзівакі, чамусьці хочуць танцаваць і ў суботу, і ў нядзелю.

Але нядоўга быў заклапочаны Шарамецьеў. Недзе за спіной грымнула дружная песня першакурснікаў:

Не агрономы, не юристы мы,  
Но сожаленья в этом нет.  
А все мы будем журналистами  
И «Журналисту» шлём привет.

Раней першакурснікі такіх песень не спявалі. Не спявалі таму, што вучэбнай газеты «Журналіст» не было. А цяпер такая газета існуе. Гэта радуе. А калі чалавеку радасна, яму заўсёды хочацца спяваць. І спяваюць гэтую песню першакурснікі, хоць многія з іх ужо далёка не навічкі ў журналістыцы. Аляксандр Шлег друкуецца ў часопісе «Маладосць». У рэспубліканскіх і абласных газетах можна сустрэць імя Тані Харавец і Уладзіміра Гулько, Шуры Новік, Васіля Кошаля, Міхаіла Казакевіча, Уладзіміра Стэльмаха і многіх іншых першакурснікаў. Не хвалюйцеся, пяцікурснікі, дастойная змена прышла ва універсітэт.

Шэсце калоны журналістаў падыходзіць да канца. І няхай не крыўдзяцца на нас тыя, каго мы не ўпамянулі ў нашым перадсвяточным рэпартажы. «Калі трапляеш у кветнік, дзе многа прыгожых і розных кветак, цяжка пісаць аб усіх колерах адразу»,—гаворыць усходняя прыказка. У такім жа становішчы апынуўся і аўтар гэтага рэпартажа.

**А. РАДУЦКІ.**



**СВЯТОЧНЫ САЛЮТ У МІНСКУ.**

Фота **А. ШРУБКА.**

## Коратка

*Нядаўна на фізічным факультэце адбыўся вечар сустрэчы студэнтаў II курса са сваімі малодшымі сябрамі—першакурснікамі. Вечар прайшоў цікава і арганізавана.*

*Адбылося расшыранае пасяджэнне дыялекталагічнага гуртка. На ім былі абмеркаваны вынікі работы і намечаны планы на будучае, 16 удзельнікам гэтага гуртка ўручаны пасведчанні членаў Студэнцкага Навуковага Таварыства.*

*На біялагічным факультэце адбыўся вечар, прысвечаны 110-годдзю з дня нараджэння вялікага рускага фізіёлага І. П. Паўлава. Студэнты прачыталі навуковыя даклады, прысвечаныя гэтай даце. Затым прысутныя прагледзелі фільм аб жыцці і дзейнасці вялікага вучонага.*

*На старонках «Комсомольской правды» разгарнулася дыскусія аб духоўным аблічы савецкага чалавека. Студэнты хімфака рашылі пагутарыць аб гэтым у сваім коле. У ленпакоі інтэрната, што па вуліцы Свярдлова, яны арганізавалі абмеркаванне артыкулаў, надрукаваных у газеце. Дыскусія працякала вельмі горача. У ёй прынялі ўдзел таксама і філолагі. Было выказана шмат думак аб мастацтва, ролі прыгожага ў жыцці людзей, унутраным багацці савецкага чалавека.*

*В. КАПЦІЛОВІЧ.*



Добра папрацавалі ў перадсвяточныя дні шафёры нашага універсітэта. Калектыў гаража выканаў вытворчы план III квартала на 143,3 працэнта.

Асабліва значных поспехаў дабіліся шаферы І. Дзявочка, які выканаў план на 173,6 працэнта, М. Дудзіч, даўшы 187,3 працэнта нормы і І. Піткевіч (140,1 працэнта).

На здымку: адзін з лепшых шафераў гаража універсітэта І. Дзявочка.

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

## Марк Саламонавіч Зярніцкі

**11 лістапада гэтага года грамадскасць універсітэта адзначае 60-годдзе са дня нараджэння Марка Саламонавіча Зярніцкага—аднаго са старэйшых журналістаў рэспублікі, загадчыка кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку нашага універсітэта.**

**Імя Марка Саламонавіча, вядучага выкладчыка аддзялення, цікавага лектара і чулага выхавацеля. добра вядома работнікам друкаванага слова рэспублікі. Большасць з іх—яго непасрэдныя вучні.**

**Вялікі і цікавы жыццёвы шлях прайшоў М. С. Зярніцкі.**

**Нарадзіўся ён ў беднай сям'і рамесніка-столяра. Рана пачалося працоўнае жыццё Марка Зярніцкага—16-гадовым падлеткам вымушан быў ён зарабляць сабе на кавалак хлеба. Далейшы лёс Зярніцкага, як і мільёнаў яго аднагодкаў. вырашылі Кастрычніцкія падзеі 1917 года. Былы хлопчык на пасылках прымае актыўны ўдзел у будаўніцтве новага жыцця. Уступіўшы ў 1919 годзе ў рады ленінскага камсамола, а ў 1921—у Камуністычную партыю, Зярніцкі працуе ў партыйна-савецкіх органах маладой Беларускай рэспублікі. Хвалюючым успамінам гэтых гадоў з'явіўся ўдзел М. С. Зярніцкага ў рабоце III Усерасійскага з'езду прафсаюзаў, які адбыўся ў красавіку 1920 года. На з'ездзе Марк Саламонавіч пачуў ленінскае жывое слова—Уладзімір Ільіч выступіў з прамовай аб задачах рабочага класа і прафсаюзаў у сувязі з пераходам на мірнае будаўніцтва.**



**Рана звязаў Марк Саламонавіч Зярніцкі свой лёс з нашым друкам. Першае яго выступленнне адносіцца да 1919 года. Ужо ў 1924 годзе ён рэдагуе Магілёўскую газету «Соха и молот», у 1930—32 гг. вучыцца ў Маскве ў камуністычным інстытуце журналістыкі. Затым рэдагуе аршанскую газету «Ленинский призыв», працуе ў рэспубліканскай газеце «Звязда» намеснікам загадчыка аддзела прапаганды, рэдагуе глыбокскую газету «За новае жыццё». У 1940—41 гг. ён пераходзіць на выкладчыцкую работу, працуе дырэктарам Беларускага камуністычнага інстытута журналістыкі.**

**У гады Вялікай Айчыннай вайны Марк Саламонавіч—старшы інструктар па друку палітаддзела арміі.**

**І дзе б ні працаваў М. С. Зярніцкі, ён усюды горача бярэцца за справу, аддае ёй усю сваю энергію, свой багаты вопыт.**

**У наш універсітэт Марк Саламонавіч прышоў, дэмабілізаваўшыся з Савецкай Арміі. Спачатку ён працуе дэканам факультэта журналістыкі, а затым загадвае кафедрай тэорыі і практыкі савецка-партыйнага друку. З гэтага часу ён усе свае сілы аддае падрыхтоўцы газетных работнікаў рэспублікі, спалучаючы выкладчыцкую дзейнасць з плённай навуковай работай. Ужо ў 1949 годзе Зярніцкі абараняе кандыдацкую дысертацыю на тэму: «Газета «Звязда» ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Беларусі». Вялікай падзеяй у жыцці Зярніцкага з'явіўся выхад кнігі «Газета «Звязда» ў барацьбе за перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі», прысвечанай адной з важнейшых тэм гісторыі беларускай журналістыкі.**

**У цяперашні час навукова-даследчая думка Марка Саламонавіча накіравана на пытанні гісторыі партыйна-савецкага друку ў гады іншаземнай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны. Гэта — тэма яго доктарскай дысертацыі.**

**У дзень 60-годдзя студэнты і выкладчыкі універсітэта горача віншуюць паважанага юбіляра і жадаюць яму вялікіх і плённых творчых поспехаў у жыцці і рабоце.**

**Днямі адбылася XIII камсамольская канферэнцыя універсітэта. Дэлегаты заслухалі справаздачны даклад камітэта камсамола. Затым разгарнуліся спрэчкі, у якіх выступілі студэнт матфака М. Варын, студэнты юрфака А. Тарасенка і Валевіч, намеснік сакратара камітэта камсамола аўтазавода т. Канаграй, загадчык кафедры фізвыхавання Я. Г. Маркаў, студэнты біяфака А. Малашэвіч і Сіняк, першы сакратар ЦК ЛКСМБ Г. А. Крыулін, студэнт гістфака Кардымон, сакратар камсамольскай арганізацыі беларускага аддзялення У. Ганчароў, дацэнт В. А. Захарава, сакратар камсамольскай арганізацыі адміністрацыйна-гаспадарчай часткі Тараканава, аспірант Г. Герасіменка, студэнт пятага курса хімічнага факультэта Г. Браніцкі, сакратар парткома універсітэта С. Я. Янчанка і іншыя. Ніжэй мы друкуем матэрыялы канферэнцыі.**

## На правільным шляху

*(З выступлення першага сакратара ЦК ЛКСМБ тав. Г. А. КРЫУЛІНА).*

*Камсамольская арганізацыя Беларускага універсітэта—здаровая, моцная. ЦК камсамола Беларусі лічыць, што камітэт камсамола на працягу ўсяго года быў на правільным шляху, правільна разумеў сваю ролю ў сістэме нашай асветы.*

*Усё ж камітэту камсамола больш трэба займацца паспяховасцю студэнтаў. Трэба менш збіраць фактаў, а жыць адным жыццём з групамі і курсамі. Неабходна падумаць і аб тым, каб значна расшырыць колькасць членаў СНТ.*

*Камсамольцы універсітэта робяць добрую справу, дапамагаючы рабочым у авалоданні ведамі. Шосты Пленум ЦК ВЛКСМ аб'явіў паход за паляпшэнне выхавання моладзі ў духу марксізма-ленінізма. Камсамольскай арганізацыі універсітэта пад сілу ўзяць значна больш прадпрыемстваў пад свае шэфства.*

*Трэба, каб камітэт камсамола, абраны на гэтай канферэнцыі, і ў далейшым быў верным памочнікам рэктарата ў справе выхавання ўсебакова адукаваных спецыялістаў.*

## Мацаваць дружбу

*(З выступлення намесніка сакратара камітэта камсамола аўтазавода т. КАНАГРАЙ*

*Нашы камсамольскія арганізацыі звязвае цесная дружба. Кожную нядзелю вашы студэнты прыязджаюць у інтэрнаты да рабочых, дзе аказваюць ім дапамогу ў авалоданні ведамі.*

*Пажадана было б, каб студэнты аддзялення журналістыкі накіроўваліся ў шматтыражку нашага завода на практыку. Гэтым яны аказалі б нам вялікую дапамогу.*

## Увесці курс нотнай граматы

*(З выступлення студэнта II курса гістфака т. КАРДЫМОНА).*

*З году ў год на камсамольскай канферэнцыі універсітэта падымаецца пытанне аб выкладанні студэнтам тэорыі музыкі. Пажадана было б, каб, нарэшце, рэктарат увёў у гэтым годзе для нас курс музыкі, з тым каб нам не прыходзілася чырванець перад дзяцьмі ў школе, калі яны просяць праспяваць па нотах песню.*

### ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

☆ Студэнтамі універсітэта адпрацавана 136.728 рабочых гадзін. У сярэднім на кожнага студэнта прыпадае 48 рабочых гадзін.

☆ Члены лектарскай групы камітэта камсамола прачыталі звыш 750 лекцый і дакладаў на прадпрыемствах горада, у маладзёжных інтэрнатах, у калгасах і саўгасах рэспублікі.

☆ У аглядзе-конкурсе мастацкай самадзейнасці факультэтаў прынялі ўдзел 325 чалавек.

☆ Універсітэцкія калектывы мастацкай самадзейнасці далі звыш 60 канцэртаў.

☆ У 12 сярэдніх школах горада працавалі піянерважатымі 130 камсамольцаў.

☆ У рабоце навукова-даследчых гурткоў прымала ўдзел больш як 1.100 студэнтаў, што складае звыш 1/3 усіх студэнтаў універсітэта.

☆ У 1958—59 навучальным годзе ў члены СНТ прыняты 160 студэнтаў. У СНТ універсітэта зараз налічваецца звыш 400 чалавек.

# ДА НОВЫХ ПОСПЕХАЎ!

**(Са справаздачнага даклада сакратара камітэта камсамола І. СЯРГЕЕВА).**

Наша камсамольская канферэнцыя сабралася ў знамянальныя гістарычныя дні, калі па ўсёй краіне разгарнуўся ўсенародны рух за выкананне велічнай праграмы разгорнутага будаўніцтва камуністычнага грамадства, якую намеціў XXI з'езд КПСС.

Асноўнай задачай камсамольскай арганізацыі універсітэта была і застаецца задача па выхаванню высокакваліфікаваных, адданых справе марксізма-ленінізма спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Веды нашых студэнтаў сталі больш глыбокімі, чым у папярэднія гады. Так, з 2.093 камсамольцаў першых — чацвёртых курсаў, здаваўшых экзамены ў летнюю сесію, 134 атрымалі толькі выдатныя адзнакі, 605 камсамольцаў здалі сесію на «добра» і «выдатна». Не без гонару камсамольская арганізацыя называе сваіх лепшых таварышаў, якія з сесіі ў сесію атрымліваюць толькі выдатныя адзнакі.

Большасць з іх спалучаюць вучобу з паспяховай грамадскай работай. Гэта Рубанаў, Кадыка, Рубінаў (фізфак), Казлова, Хадановіч, Тарасевіч (філфак), Налівайка, Міранчыкава, (гістфак), Печань, Шушкіна (біяфак), Браніцкі, Самускевіч (хімфак), Наркун, Усава (матфак).

Аднак, за добрымі паказчыкамі паспяховасці крыюцца і значныя недахопы і ўпушчэнні. Ужо той факт, што 13,1 працэнта студэнтаў пасля заканчэння навучальнага года мелі акадэмічную запазычанасць, гаворыць сам за сябе. У тых камсамольскіх групах, дзе ёсць добры маналітны калектыў, дзе добра працуюць камсамольскія бюро, дзе пытанням вучобы ўдзяляецца паўсядзённая ўвага,— там і паспяховасць добрая, і жыццё камсамольскае б'е крыніцай.

Значную дапамогу камітэту камсамола ў павышэнні паспяховасці змаглі б аказаць аспіранты. Аднак толькі нямногія з іх былі ў віры нашага агульнага жыцця.

Камсамольская арганізацыя універсітэта дабілася пэўных поспехаў у напрамку выхавання сур'ёзных адносін у студэнтаў да працы, у прывіцці навыкаў бытавога абслугоўвання. На мінулай камсамольскай канферэнцыі было прынята рашэнне кожнаму камсамольцу універсітэта за год адпрацаваць 48 гадзін. Прынятае абавязацельства камсамольцы універсітэта выканалі з гонарам. Але не трэба забываць, што за вялікімі ўвогуле лічбамі гадзін, што адпрацаваны нашымі студэнтамі-камсамольцамі, хаваюцца белаdensitiesручкі, тыя, што цураюцца чарнавой работы.

Вялікую ролю адыгрываюць у грамадскім жыцці факультэтаў насценныя газеты, якіх ва універсітэце налічваецца 29. Лепшай сярод іх з'яўляецца «За мічурынскую біялогію», якая па праву заняла першае месца на аглядзе—конкурсе, прысвечаным Дню друку. Камітэтам камсамола сумесна з парткомам двойчы праводзіліся нарады рэдактараў факультэцкіх насценных газет.

Камітэтам камсамола не радзей двух разоў у месяц праводзіліся культпаходы. Студэнты універсітэта мелі магчымасць бачыць і чуць выступленні эстраднага аркестру МДУ, маладзёжнага ансамбля песні і танца Румыніі, самадзейнасць трактарнага завода, палітэхнічнага інстытута. У 1960 годзе наш універсітэт будзе прымаць удзел у традыцыйным свяце песні Прыбалтыйскіх рэспублік і гарадоў Кіева, Мінска, Ленінграда, які адбудзецца ў Вільнюсе.

Студэнты універсітэта аказвалі дапамогу ў авалодванні ведамі рабочым завода імя Варашылава. аўтамабільнага, завода запасных частак, аўтарамонтнага. Многія камсамольцы працавалі ў якасці піянерважатых у школах горада.

Першыя крокі ў самаабслугоўванні паказалі, што студэнты могуць падтрымліваць яшчэ лепшы парадак у сваіх пакоях і аудыторыях, чым гэта маглі зрабіць прыбіральшчыцы. Якасць уборкі ў інтэрнатах правяраецца два разы ў месяц санітарнымі камісіямі, камітэтам камсамола сумесна з прафкомам. Рэгулярна праводзяцца конкурсы на лепшы інтэрнат і на лепшы пакой.

Камітэт камсамола імкнуўся вучыць камсамольскай рабоце перш за ўсё актыў груп, курсаў. Былі наладжаны семінары камсамольскага актыву. Неаднаразова скліканіся нарады адказных за сектары факультэцкіх бюро. Нам трэба больш увагі ўдзяляць выхаванню актыву з ліку выдатнікаў вучобы, актыўных членаў навуковага таварыства, аматараў спорту, памятаючы пры гэтым, што толькі той, хто сам гарыць, можа запаліць другога.

## З Пастановы камсамольскай канферэнцыі

... Лічыць важнейшай задачай камсамольскай арганізацыі камуністычнае выхаванне студэнтаў, аказанне паўсядзённай дапамогі рэктарату і партыйнай арганізацыі у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, дастойных будаўнікоў камуністычнага грамадства.

... Канферэнцыя лічыць неабходным, каб усе студэнты прынялі ўдзел ва Усесаюзным паходзе за авалодванне агульнаадукацыйнымі і тэхнічнымі ведамі маладымі рабочымі.

... Рэкамендаваць камітэту камсамола стварыць групу па вывучэнню гісторыі камсамола БДУ і сумесна з кафедрай гісторыі БССР напісаць летапіс камсамольскай арганізацыі універсітэта.

... Абавязаць камітэт камсамола і факультэцкія камсамольскія бюро палепшыць кіраўніцтва камсамольскімі групамі, перыядычна заслухоўваць на пасяджэннях факультэцкіх бюро справаздачы групоргаў.

## Без жывінкі ў рабоце

*(З выступлення М. ВАРЫНА, члена камітэта камсамола)*

*Камітэт камсамола недастаткова змагаўся за паспяховасць студэнтаў. Адказная за акадэмічны сектар В. Аляхновіч мала цікавілася пытаннямі вучобы. Яе работа зводзілася да падліку агульнай колькасці выдатнікаў і неспяваючых.*

*Слаба здзяйсняўся кантроль за работай камітэта камсамола. Работнікі Ленінскага райкома камсамола калі і бывалі ва універсітэце, дык не далей камітэта камсамола.*

*У дакладзе прыводзілася вялікая агульная лічба выпрацаваных студэнтамі гадзін. За ёй трэба бачыць і тых, хто не прымаў ніякага ўдзелу ў грамадскай працы, і строга пакараць іх.*

## Шырыць маштабы

*(З выступлення дацэнта В. А. ЗАХАРАВАЙ)*

*Нажаль, на многія цікавыя сустрэчы з пісьменнікамі, артыстамі, літаратурныя дыспуты, што праводзяцца ў актавай зале, мала з'яўляецца студэнтаў-фізікаў, хімікаў, матэматыкаў. І мерапрыемства, запланаванае як агульнаўніверсітэцкае, часта ахоплівае толькі студэнтаў філалагічнага факультэта. Гэта недапушчальна. Поспехі прыродазнаўчых навук ніколькі не павінны паслабляць інтарэсы моладзі да літаратуры і мастацтва.*

## А зараз ён пяе?

*(З выступлення аспіранта Г. ГЕРАСІМЕНКІ)*

*Многія паступаючыя ва універсітэт у сваіх аўтабіяграфіях пішуць, што быў у школе ці на прадпрыемстве вельмі актыўным, удзельнічаў у грамадскім жыцці, займаўся спортам, спяваў, танцаваў, іграў. Калі ж яго залічваюць у лік студэнтаў, то адмаўляецца прымаць удзел ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзяцца камсамольскай арганізацыяй. Так, студэнт філфака І. Пратасеня да паступлення ва універсітэт выступаў з сольнымі нумарамі, а зараз адмаўляецца спяваць у хоры. Тое ж можна сказаць і аб Кажэўнікавай (філфак). Студэнт фізфака Багрынцаў адмовіўся ад удзелу ў аркестры, хоць ён добра іграе на баяне.*

*У гэтым годзе самадзейнасць нашага універсітэта пryме ўдзел у III свяце песні і танца ў Вільнюсе, таму неабходна, каб камітэт камсамола больш унікаў у справы самадзейных калектываў.*

### ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

☆ Даследчай работай студэнтаў кіруюць 17 прафесараў доктараў навук, 70 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

☆ У гэтым годзе на гарадскі агляд пададзена 115 студэнцкіх навуковых работ.

☆ 2.400 студэнтаў з'яўляюцца членамі спартыўнага клуба 277 займаюцца ў факультэцкіх секцыях па валейболу, баскетболу, шахматах, настольнаму тэнісу.

☆ Факультэцкія фізкультурныя бюро правялі 16 сустрэч па ўсіх відах спорту з камандамі іншых ВНУ і прадпрыемстваў.

☆ За 1958 год падрыхтавана 170 шафёраў-аматараў і 100 матацыклістаў. За 1959 год—78 шафёраў і 12 матацыклістаў. У лістападзе гэтага года будзе выпушчана яшчэ 145 шафёраў і 30 матацыклістаў.

## Новы склад бюро

XIII камсамольская канферэнцыя абрала камітэт камсамола універсітэта ў складзе 41 чалавека.

Адбылося першае арганізацыйнае пасяджэнне камітэта камсамола, на якім было абрана бюро з 11 чалавек. Абавязкі паміж членамі бюро размеркаваліся наступным чынам:

І. СЯРГЕЕЎ—сакратар камітэта камсамола.

І. СТАРАВОЙТАЎ — намеснік сакратара камітэта камсамола па палітыка-выхаваўчай рабоце.

М. ВАРЫН—намеснік сакратара камітэта камсамола па акадэмічнай рабоце.

В. СЕМЯНЯКА—намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце.

В. ПРАКОШЫН — адказны за культурна-масавую работу.

Л. КЕНДА—адказны за жыллёва-бытавы сектар.

Г. ГАЛКОЎСКАЯ—адказная за навукова-даследчую работу.

Я. ПЕТУШКОВА—адказная за падпіску на перыядычныя выданні.

А. ЖАДАН—адказны за спартыўную работу.

В. КІСЯЛЁЎ—адказны за арганізацыю працы студэнтаў.

**ПЕРШАКУРСНІКУ АБ НАШЫМ МІНСКУ**

## ДОМІК ЛЯ СВІСЛАЧЫ

**Ты жывеш у сэрцы Беларусі ўжо больш двух месяцаў, наш сябра, студэнт І-га курса. Для цябе ўсё незнаёмае, новае. Куды пайсці ў вольны час? У кіно, тэатр, музей? Мы хочам табе дапамагчы ў гэтым. І сёння пачынаем серыю невялікіх расказаў аб Мінску.**

☆

Прайдзіся па праспекту імя Сталіна. Адразу ж за мастом праз Свіслач на левым яе беразе ты ўбачыш маленькі драўляны домік сярод акуратна пасаджаных дрэўцаў. Тут, у гэтым доме, на былой Захар'еўскай вуліцы на кватэры рабочага-чыгуначніка 1(13) сакавіка 1898 года сабраліся дзевяць марксістаў, дзевяць прадстаўнікоў сацыял-дэмакратычнай арганізацыі Расіі. Пасланцы Пецярбургскага, Маскоўскага, Екацярынаслаўскага і Кіеўскага «Саюзаў барацьбы за вызваленне рабочага класа», пасланцы рэдакцыі «Рабочай газеты» і ўсеагульнага яўрэйскага саюза Бунда, сабраліся, каб пакласці пачатак аб'яднанню марксісцкіх сіл Расіі, каб згуртаваць мясцовыя сілы, гурткі і арганізацыі рускай сацыял-дэмакратыі ў адзіную Расійскую сацыял-дэмакратычную рабочую партыю.

Уладзімір Ільіч Ленін знаходзіўся тады ў ссылцы ў сяле Шушанскім. Яго адсутнасць аказала ўплыў на рашэнні з'езду, частка якіх не адпавядала мэтам пабудовы адзінай марксісцкай партыі.

«Маніфест» з'езду аб'явіў стварэнне партыі, але на справе партыя не была арганізавана, бо не было праграмы і статута, не было адзінага цэнтра. Члены ЦК, абраныя на з'ездзе, былі хутка арыштаваны царскімі жандармамі.

Але з'езд аказаў вялікае ўздзеянне на вызваленчы рух у Расіі.

Праз 25 год пасля з'езду ў тым жа доме, дзе ён адбыўся, быў адкрыт дом-музей першага з'езду РСДРП. У час Вялікай Айчыннай вайны ён быў разбураны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1948 годзе адбылося другое нараджэнне доміка. Аб гэтым патурбаваліся будаўнікі Мінска.

Такім чынам, музей існуе ўжо 36 год. За гэты час яго наведала некалькі сот тысяч экскурсантаў з розных гарадоў краіны і свету. І ты абавязкова павінен там пабываць, студэнт першага курса.

**Я. ЛЯХАЎ.**

РЭДАКТАР М. ЦІКОЦКІ.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19.

АТ 10816. Зак. 1665. Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна. Тыраж 2000 экз.